**Асіноўскі, С.** Лёс бібліятэкі Полацкага Сафійскага сабора / С. Асіноўскі // Архівы і справаводства. — 2012. — № 6. — С. 138—149.

# ЛЁС БІБЛІЯТЭКІ ПОЛАЦКАГА САФІЙСКАГА САБОРА

**Сярод шматлікіх дат, што зафіксаваны ў айчыннай гісторыі, ёсць дзве, якія тычацца полацкай мінуўшчыны і звязаны з драматычнымі падзеямі Інфлянцкай ці, па-другому, Лівонскай вайны 1558–1582 гадоў, пазначанай у энцыклапедыях, як *«вайна Маскоўскай дзяржавы з Інфлянцкім ордэнам, Вялікім княствам Літоўскім і Польшчай за Інфлянты»* (гістарычная назва зямель Усходняй Прыбалтыкі, цяперашняй тэрыторыі сучасных Латвіі і Эстоніі). Як вядома, паўночна-ўсходняя частка беларускіх зямель пад час гэтай вайны стала арэнай бязлітасных ваенных дзеянняў...**

**Не станем засяроджваць увагу чытачоў на падрабязных аспектах ходу гэтай узброеннай барацьбы (што і нс з'яўляецца нашай мэтай), а назавем узгаданыя вышэй даты. 15 лютага 1563 года асаджаны 60-тысячным маскоўскім войскам Полацк капітуляваў пасля двухтыдневай аблогі... Прайшло больш шаснаццаці гадоў, і 30 жніўня 1579 года ўжо маскоўскі гарнізон Полацка таксама капітуляваў пасля амаль трохтыднёвай аблогі 40-тысячным войскам на чале з вялікім князем літоўскім і каралём польскім Стэфанам Баторыем...**

**Пазначаны вышэй 1579 год стаў апошнім годам існавання беларускага культурнага феномена, вядомага яі бібліятэка Полацкага Сафійскага сабора, што ў тых жа энцыклапедыях названа *«самай старажытнай бібліятэкай Беларусі»*... Менавіта ў выніку драматычных падзей гэтых шаснаццаці гадоў (ад адной аблогі – да другой) гэты ўнікальны культурны аб'ект быў выкраслены з айчыннай гісторыі... Многія даследчыкі беларускай мінуўшчыны лічаць, што назаўсёды...**

На жаль, лёс **бібліятэкі Полацкага Сафійскага** сабора гаворка пра якую пойдзе ніжэй, не з'яўляецца чымсьці незвычайным. Рабавалі бібліятэкі або (што яшчэ горш) бязлітасна палілі кнігі многія заваёўнікі і цемрашалы. І не абавязкова яны былі неадукаванымі варварамі. Досыць многія чыталі ці чулі аб трагічным лёсе легендарнай **Александрыйскай бібліятэкі** – унікальнага кнігазбору, што налічваў (па розных звестках) ад ста да сямісот тысяч тамоў. Заснаваная ў **пачатку III стагоддзя да нашай эры** яна за сваю шматвекавую гісторыю перажыла некалькі катастрафічных пажараў і была канчаткова знішчана недзе ў **VII** ці **VIII стагоддзі** ўжо **новай эры** падчас арабскіх заваёў **Егіпта...** І рукапісы, і кнігі, якім бы крыўдным гэта ні было, усё ж такі гараць...

Але вернемся да нашай бібліятэкі...

Безумоўна, яна не такая старая, як тая ж Александрыйская, у якой захоўваліся творы старажытнагрэчаскай літаратуры і навукі і якую ў розныя часы ўзначальвалі такія сусветнавядомыя вучоныя, як **Эратасфен, Зенадот, Арыстарх Самоскі, Калімах.** Але ў маштабах айчыннай гісторыі гэта бібліятэка досыць старажытная: яе ўзнікненне даследчыкі адносяць да **сярэдзіны XI стагоддзя.** Некаторыя з іх называюць і куды больш дакладную дату: **1066 год,** калі быў заснаваны **Полацкі Сафійскі сабор.** Ёсць меркаванне, што пачатак гэтаму кнігазбору паклаў полацкі **князь Усяслаў,** вядомы як **Чарадзей.** Хаця збіраннем рукапісаў і кніг у Полацку займаўся яшчэ на мяжы **X** і **XI стагоддзяў** сын легендарнай **Рагнеды князь Ізяслаў,** якога сучаснікі называлі «**кніжнікам».**

Унучка Усяслава, **Прадслава,** якая ўвайшла ў гісторыю як **Ефрасіння Полацкая,** недзе ў **сярэдзіне XII стагоддзя** заснавала ў Сафійскім саборы **скрыпторый –** майстэрню па перапісванню старажытных манускрыптаў, і менавіта пры ёй бібліятэка стала буйным культурным цэнтрам не толькі **Полацкага**

**княства,** але і ўсіх **усходнеславянскіх зямель.** Тут захоўваліся не толькі рукапісныя кнігі (пераважна рэлігійнага зместу), але і арыгінальныя помнікі старажытна-рускай літаратуры. Некаторыя даследчыкі мяркуюць, што як раз тут захоўваўся і легендарны **Полацкі летапіс,** які, як лічыцца, не збярогся, але, на думку вядомых гісторыкаў **Сяргея Салаўёва, Уладзіміра Пашуты, Леаніда Аляксеева,** урыўкамі ўвайшоў у другія летапісы (напрыклад, **Кіеўскі** і **Іпацьеўскі)...**

Справу, пачатую полацкімі князямі Ізяславам і Усяславам і разгорнутую Ефрасінняй Полацкай, на працягу некалькіх стагоддзяў настойліва прадаўжалі многія **рупліўцы – асветнікі.** Такім чынам, іх намаганнямі к **XVI стагоддзю** бібліятэка Полацкага Сафійскага сабора стала **самай багатай і шырока вядомай** на беларускай зямлі... Але пачалася згаданая вышэй **Лівонская вайна...**

Аматарам гісторыі добра вядома імя **Рэйнгольда Гейдэнштэйна,** нямецкага і польскага храніста і дыпламата. Яго пяру належыць манументальная праца – **«Запіскі аб Маскоўскай вайне»,** якая пабачыла свет у **1578–1582 гадах.** Пэўны час Гейдэнштэйн быў **сакратаром** Стэфана Баторыя і, натуральна, сведкам падзей Лівонскай вайны. У сваіх **«Запісках»** ён дакладна, у храналагічнай паслядоўнасці апісаў яе ход, у тым ліку аблогу і штурм Полацка войскам Баторыя ў жніўні 1579 года, яскрава паказаў рабаўніцтва, жахі і пакуты тутэйшага насельніцтва...

Менавіта ў «Запісках» Гейдэнштэйна з'явіліся **першыя пісьмовыя сведчанні** аб бібліятэцы Полацкага Сафійскага сабора...

Такім чынам, са сказанага вышэй вынікаюць **наступныя высновы... Па-першае,** існаванне бібліятэкі Полацкага Сафійскага сабора – **гістарычны факт.** На наш погляд, нават можна больш-менш прыблізна акрэсліць перыяд яе знаходжання ў Полацку: **1066–1579 гады** (больш за **пяць стагоддзяў).** І, **па-другое,** з Полацка бібліятэка знікла пад час Лівонскай вайны. Але ў якім напрамку?

На гэта пытанне пэўнага адказу няма і сёння... Існуе толькі **некалькі версій** (і не ўсе яны падмацаваныя фактамі)...

Перад аўтарам гэтых нататкаў, натуральна, паўстаюць **пытанні:** з якой з іх пачаць і якой аддаць перавагу? І Як ужо адзначалася вышэй, **31 студзеня 1563 года** Полацк быў аблажаны больш чым 60-тысячным маскоўскім войскам пад асабістым началамм **цара Івана IV Грознага. 15 лютага полацкі ваявода Станіслаў Давойна,** не дачакаўшыся дапамогі, здаў горад і прыбыў у стаўку пераможцы. Па тагачаснай «традыцыі», заваёўнікі разрабавалі Полацк. Як адзначаюць пісьмовыя крыніцы яны пасеклі манахаў – бернардзінцаў, патапілі ў Дзвіне тамтэйшых яўрэяў. Тысячы палачан (найперш адмысловых рамеснікаў) і ўсю шляхту (дарэчы, і ваяводу Давойну) былі выведзены ў маскоўскі палон. Пачалася **шаснаццацігадовая акупацыя Полацка...**

**Некаторыя даследчыкі** мяркуюць, што якраз у гэтыя гады бібліятэка Полацкага Сафійскага сабора была вывезена ў **Маскву...**

Так гэта ці не так? Пэўнага адказу на гэта пытанне няма... Якіх-небудзь звестак аб знаходжанні у расійскіх бібліятэках, архівах або музеях рарытэтаў з полацкага кнігазбору пакуль што няма (але гэта ні ў якім разе не выключае таго, што такія знахрдкі могуць з часам з'явіцца)...

Існуе меркаванне, што значная частка біблятэкі магла быць папросту **спалена** заваёўнікамі. Вось, на-прыклад, што піша з гэтай нагоды даследчык полацкай даўніны, беларускі пісьменнік **Уладзімір Арлоў:** «*У рукі да маскавітаў трапіла бібліятэка Сафійскага сабора з цудоўнымі Скарынавымі выданнямі. Царскія дзякі разглядалі іх са здзіўленнем і засцярогаю: ці не ад д'ябла тое штукарства? У Вялікім княстве Літоўскім друкарні існавалі ўжо сорак гадоў. У Масковіі друкаваная кніга, дзякуючы Івану Фёдараву і Пятру Мсціслаўцу (абодва, дарэчы, белйрусы) з'явіцца толькі праз год пасля захопу Полацка. Каб*

*вынішчыць памяць палачанаў пра сваю дзяржаву і колішнія вольнасці, царскія служкі палілі ці вывозілі старажытныя граматы».*

У гэтым жа кантэксце Уладзімір Арлоў робіць **дапушчэнне,** што ў гэты ж час мог быць знішчаны ці вывезены і згаданы вышэй Полацкі летатапіс...

Цяпер звернемся да **наступкай версіі** – прыгожай, рамантычнай, з тых, што ва ўсе часы бударажаць фантазію шукальнікаўскарбаў...

У **1923 годзе Вацлаў Ластоўскі,** вядомы беларускі гісторык, філолаг, этнограф, пісьменнік, аўтар **«Кароткай гісторыі Беларусі»** (1910 год) і **«Гісторыі беларускай (крыўскай) кнігі»** (1926 год) апублікаваў у № 2 часопіса «Крывіч» гістарычную аповесць «Лабірынты». Паводле Ластоўскага, яе герой пад час размовы з тамтэйшымі краязнаўцамі даведваецца наступнае: *«Кажуць, пад Верхнім замкам, за магілай невядомага валадара, ёсць склады з багаццямі вялікімі. Кажуць, у абход абшырнай грабніцы, направа, ёсць мураваны праход, крокаў шэсцьдзесят даўжыні, і праз яго ўходзіццаў сховы са старымі кнігамі... Зложаны кнігі ў каваных серабром скрынях, у сярэдзіне абітых скурай»...*

Суразмоўнікі героя «Лабірынтаў» *«...аднагалосна ўтрымлівалі, што бібліятэка гэтая* (маецца на ўвазе бібліятэка Сафійскага сабора – *С. А.) была тады* (пад час Лівонскай вайны – *С. А.) добра схавана і сягоння ёсць недзе ў падземных полацкіх лёхах».*

Урэшцэ рэшт, наш герой знаходзіць легендарную бібліятэку… Але, на жаль, адбываецца гэта толькі ў аповесці Ластоўскага…

Дарэчы, полацкія «лабірынты», верагодна, існавалі (а, можа, і існуюць) на самой справе. Як сведчыць ужо згаданы Уладзімір Арлоў (які, між іншым, сам займаўся іх пошукам), *«іх даследаваў і склаў у 1864 годзе падрабязны план археолаг і мастак Дзмітрый Струкаў. Захаваліся апісанні некалькіх падземных-экспедыцый, зладжаных на пачатку мінулага стагоддзя»...*

Прыгожая казка, рамантычная легенда, не пацверджаная ні адным, нават самым маленькім фактам? Можа, і так...

Але ж і гамераўская **Троя** (або **Іліяда**) доўгія стагоддзі таксама лічылася не больш чым прыгожай легендай, пакуль нямецкі археолаг **Генрых Шліман** не знайшоў яе руіны (і, дарэчы, унікальны скарб, вядомы як «золата Троі») у **1865 годзё ў Турцыі**, на пагорку **Гісарлык**...

Нарэшце, аддаўшы належнае здагадкам і легендам, звернемся да яшчэ **адной версіі** аб лёсе бібліятэкі Полацкага Сафійскага сабора. Тыя, хто яе прытрымліваюцца, на гэты раз маюць на ўзбраенні **некаторыя факты**... З іх аналізу вынікае, што бібліятэка Полацкага Сафійскага сабора пасля 1579 года, калі Стэфан Баторый адваяваў Полацк у Івана IV Грознага, была вывезена (часткова або поўнасцю) на захад, у **Польшчу**...

Да такой высновы прыводзяць ужо згаданыя вышэй **«Запіскі аб Маскоўскай вайне» Рэйнгольда Гейдэнштэйна**, а таксама даследаванні вядомага расійскага гісторыка **Яраслава Шчапава.** На наш погляд, найбольш канцэнтравана меркаванні апошняй версіі выказаў цяперашні дырэктар **Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі Раман Матульскі** (які, дарэчы, лічыць старажытны полацкі кнігазбор папярэднікам галоўнай бібліятэкі нашай краіны), грунтуючыся якраз на выказваннях Гейдэнштэйна і Шчапава, а таксама на фактах, аб якіх крыху ніжэй...

У сваіх «Запісках» Гейдэнштэйн занатаваў наступнае: *«У вачах адукаваных людзей амаль не меншую каштоўнасць, чым уся астатняя здабыча мела знойдзеная там бібліятэка. Акрамя летапісаў, у ёй было шмат твораў грэчаскіх бацькоў царквы і сярод іх творы Дыянісія Арэапагіта аб нябеснай і царкоўнай*

*іерархіі, усё на славянскай мове. Вялікая частка гэтых твораў, па сведчанні летапісаў, была перакладзеная з грэчэскай мовы Мяфодзіем і Канстанцінам».*

Па меркаванні Яраслава Шчапава (а ён, па словах Матульскага, *«правёў найбольш поўнае ў сучасным бібліятэказнаўстве і кнігазнаўстве даследаванне гісторыі бібліятэкі Полацкага Сафійскага сабора»),* які таксама вывучаў «Запіскі» Гейдэнштэйна, полацкія кніжныя скарбы былі вывезены ў **Польшчу...**

Раман Матульскі канстатуе: *«Як пацвердзілі далейшыя даследаванні, кнігі з бібліятэкі Полацкага Сафійскага сабора былі падзелены на часткі. Адна з іх патрапіла ў Кракаў у каралеўскую бібліятэку, дзе і знаходзілася да XVII стагоддзя. Затым след полацкіх кніг згубіўся разам са слядамі каралеўскай бібліятэкі. Другая частка кніг апынулася ў Яна Замойскага* (канцлер і гетман вялікі каронны – *С. А.): ён перадаў яе ў заснаваную ім у 1594 годзе ў горадзе Замосце акадэмію. Бібліятэка ардынацыі Замойскай захоўваецца цяпер у Варшаве ў Нацыянальнай бібліятэцы Польшчы. У яе фондзе ўдалося выявіць 11 кніг, з рознай ступеню верагоднасці, што яны належалі Полацкаму сабору. Кнігі Полацкага сабора ў тым жа Замосці трапілі ў праваслаўную царкву, пры якой была брацкая школа. Адна з гэтых кніг захоўваецца ў цяперашні час у бібліятэцы Львоўскага дзяржаўнага ўніверсітэта імя Івана Франка».*

Такім чынам, факталагічнае пацвярджэнне на гэты момант знаходзіць толькі **апошняя** версія, згодна з якой сляды бібліятэкі Полацкага Сафійскага сабора выяўлены ў **Варшаве** і **Львове.** Што, тым не менш, не выключае знаходжання іх (з цягам часу) і ў другіх месцах (свет, як кажуць, вялікі). Нават у легендарных полацкіх падзямеллях..:

Згаданы намі раней Раман Матульскі, які, па яго словах, імкнецца *«аднавіць састаў кніг бібліятэкі Полацкага Сафійскага сабора»,* робіць выснову, што *«ў бібліятэцы... захоўваўся найбольш поўны збор рукапісных кніг, створаных на той час на тэрыторыі Беларусі»...*

На жаль, аб гэтым *«найбольш поўным зборы»* нам, нашчадкам полацкіх кніжных рупліўцаў, пакуль што даводзіцца гаварыць у мінулым часе...

Пасля ўсяго сказанага вышэй, натуральна, паўстае пытанне: а ці ёсць надзея на тое, што калі не ўсе (ці нейкая частка), то хаця б асобныя рарытэты з унікальнага полацкага кнігазбору вярнуліся ў Беларусь? Надзея, безумоўна, ёсць...

Многія, напрыклад, чыталі аб тым, што нядаўна ў Магілёў вярнуўся выкуплены за немалыя грошы арыгінальны **Статут Вялікага княства Літоўскага**. Толькі што Нацыянальнай бібліятэцы Беларусі быў перададзены экзэмпляр легендарнай кнігі нашага земляка **Казіміра Семяновіча «Вялікае мастацтва артылерыі»**. Крыху раней у Беларусь вярнулася знакамітае **«Слуцкае евангелле»**...

Дарэчы, кнігі і рукапісы з Полацка (частка якіх, як ужо адзначалася, захоўваецца ў Варшаве і Львове) – далёка не адзіныя культурныя каштоўнасці (у тым ліку кніжныя), што аказаліся за межамі Беларусі. Месца знаходжанне многіх з іх вядома... Так, у **Хельсінкі** (праз Санкт-Пецярбург) патрапіла больш тысячы кніг з **Нясвіжскай бібліятэкі Радзівілаў**. У **бібліятэцы Рачыньскіх** у **Познані (Польшча)** захоўваецца **беларускі рукапісны кодэкс XVI стагоддзя**. Самая ранняя рукапісная кніга, створаная ў Беларусі (**Тураўскае евангелле**), знаходзіцца ў **бібліятэцы Акадэміі навук Літвы**. У **Цэнтральнай навуковай бібліятэцы Акадэміі навук Украіны** захоўваецца вывезеная ў пачатку XX стагоддзя са Шчорсаў (паблізу Навагрудка) **бібліятэка Храптовічаў**. **Бібліятэка Полацкай езуіцкай акадэміі** ў 1915 годзе была вывезена ў **Сімбірск** (цяпер Ульянаўск), у **Публічную бібліятэку Санкт-Пецярбурга**, а за 15 гадоў да гэтага частка яе патрапіла ў **Кіеўскую духоўную акадэмію**. У **Расійскай нацыянальнай бібліятэцы ў Санкт-Пецярбургу** захоўваюцца **83 выданні Францыска Скарыны**, **Літоўскі статут** і

**трыбунал 1733 года**, **Катэхізіс Сымона Буднага**, **статуты Вялікага княства Літоўскага XVI–XVIII стагоддзяў** і многа чаго яшчэ...

Гэты пералік можна працягваць і працягваць... Але спынімся на названых вышэй рарытэтах. І дамо слова спецыялісту... Вось меркаванне **начальніка аддзела навукова-метадычнага забеспячэння дзейнасці па ахове гісторыка-кулыурнай спадчыны Інстытута культуры Беларусі Алы Сташкевіч**: «*Фізічна вярнуць страчаныя культурныя каштоўнасці з дзяржаўных музейных або архіўных сховішчаў сёння практычна немагчыма* (напрыклад, неаднаразовыя спробы Беларусі вярнуць на радзіму бібліятэку Храптовічаў аказаліся безвыніковымі – *С. А.), існуюць заканадаўчыя забароны. У кожным выпадку мы павінны даказаць законнасць такога вяртання, але нават у гэтым выпадку пытанне вяртання, хутчэй заўсё, будзе вырашацца на вышэйшым узроўні»*.

Што ж трэба рабіць у гэтай сітуацыі, на якія захады ісці?... На думку Алы Сташкевіч, «... *на сённяшні дзень важная не толькі прамая рэстытуцыя, але і ідэнтыфікацыя каштоўнасцей. Нам перш за ўсё трэба абазначыць на міжнародным узроўні ўсе свае каштоўнасці як беларускія. Ідэнтыфікацыя беларускіх культурных каштоўнасцей надзвычай патрэбная для беларускай ідэнтычнасці і выхавання будучых пакаленняў»*.

З гэтымі словамі цяжка не пагадзіцца... Хочацца верыць, што з цягам часу, тымі ці іншымі (падкрэслім, законнымі) шляхамі, у тым ці іншым выглядзе айчынныя культурныя каштоўнасці (бібліятэчныя, музейныя, архіўныя) вернуцца ў Беларусь і яшчэ не адно стагоддзе будуць служыць на карысць нашага народа...

**Літаратура**

Арлоў ,У. А. Таямніцы полацкай гісторыі. — Мн., 1994.

Арлоў, У. Ад Полацка пачаўся свет. — Мн., 2006.

Гейденштейн, Р. Записки о Московской войне (1578-1582). — С.-Пб., 1880.

Кузьмич, К. В каких странах находятся белорусские раритеты? // Комсомольская правда в Белоруссии. — 2012. — 4—12 июля.

Ластоўскі, В. Выбраныя творы. — Мн., 1997.

Матульскі, Р. Бібліятэкі беларускага сярэднявечча // Полымя. — 2011. — № 1.

Щапов, Я.Н. О судьбе библиотеки Полоцкого Софийского собора // Вопросы истории. — 1974. — № 6.

Энцыклапедыя гісторыі Беларусі. У 6 т. Т. 2. — Мн., 1994.

***Святаслаў Асіноўскі***